ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 9 (965) | АЎТОРАК, 25 мая 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СУПРАЦОЎНІЦТВА НА 50 ГАДОЎ

**На чарговым пасяджэнні рэктарата ГДУ падпісаны генеральны дагавор аб супрацоўніцтве паміж вядучай вышэйшай навучальнай установай Беларускага Палесся і адміністрацыяй свабоднай эканамічнай зоны "Гомель — Ратон". Ён заключаны на тэрмін да 2048 года. Дагавор падпісалі рэктар ГДУ акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў і кіраўнік адміністрацыі СЭЗ "Гомель — Ратон" У.Ф.Бык.**

Нараджэнню гэтага сумеснага праекта папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа абодвух бакоў, у час якой былі вызначаны генеральныя напрамкі супрацоўніцтва.

Свабодная эканамічная зона (СЭЗ) "Гомель — Ратон" была створана ў 1998 годзе Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У яе ўваходзіць так званы паўночны прамысловы вузел г.Гомеля з прылягаючымі да яго тэрыторыямі агульнай плошчай 47 км². Яна мае спрыяльныя для інвестараў мясцовыя ўмовы. Перш за ўсё — гэта наяўнасць на тэрыторыі СЭЗ базы прадпрыемстваў радыёэлектронікі, прыборабудавання, машынабудаўнічай, электратэхнічнай і кабельнай прамысловасці.

Яе мэтамі з'яўляюцца прыцягненне інвестыцый на тэрыторыю свабоднай эканамічнай зоны, пашырэнне міжнародных эканамічных, прававых і фінансавых сувязяў Рэспублікі Беларусь неўрадавага характару, развіццё арыентаваных на экспарт вытворчасцей, інтэграцыя нашай рэспублікі ў сусветную эканоміку, умацаванне і пашырэнне гаспадарчых і фінансавых зносін з краінамі СНД.

СЭЗ стане ў перспектыве цэнтрам эканамічнага і фінансавага развіцця нашага рэгіёна. Сваю важную ролю ў гэтым павінна адыграць вузаўская навука. Што канкрэтна можа прапанаваць для СЭЗ універсітэт? У першую чаргу — свой вялікі навуковы патэнцыял.

Па ўмовах падпісанага дагавора ГДУ, у прыватнасці, абавязуецца ажыццяўляць навуковае суправаджэнне такіх напрамкаў, як развіццё макра- і мікраэканомікі СЭЗ, удзельнічаць у распрацоўцы канцэпцыі "беларускага шляху" развіцця свабодных эканамічных зон, праводзіць бізнес-планаванне развіцця СЭЗ, забяспечыць аграхімічнае абследаванне і агракартаванне земляў свабоднай эканамічнай зоны, якія будуць выкарыстоўвацца для вырошчвання раслінnай прадукцыі, працаваць над камп'ютэрнымі тэхналогіямі праектавання і кіравання і інш.

Свабоднай эканамічнай зоне, безумоўна, патрэбны спецыялісты высокага ўзроўню. ГДУ будзе праводзіць іх мэтавую падрыхтоўку на аснове заявак адміністрацыі СЭЗ.

У сваю чаргу, прадпрыемствы свабоднай эканамічнай зоны прадставяць для студэнтаў ГДУ базы вытворчых і пераддыпломных практык, спецыялісты СЭЗ стануць кіраўнікамі курсавых і дыпломных праектаў студэнтаў ГДУ, будуць чытаць ім лекцыі па пытаннях развіцця СЭЗ.

Адміністрацыя свабоднай эканамічнай зоны абавязуецца фінансаваць распрацоўку навуковых праектаў вучоных універсітэта па напрамках развіцця СЭЗ.

Дагавор з'яўляецца базавым, на працягу далейшай сумеснай дзейнасці будзе дапаўняцца і канкрэтызавацца.

**Т.ДУБЯК.**



**На здымку:** у час падпісання дагавора аб супрацоўніцтве паміж ГДУ і СЭЗ "Гомель — Ратон".

Фота **У.Чысціка.**

## МИР ЧЕРЕЗ КУЛЬТУРУ

Завершился международный марш "В защиту культуры под Знаменем Мира", который проходил с 15 апреля по 14 мая под эгидой ООН и ЮНЕСКО. В нем участвовали общественные и культурные организации городов России и Беларуси. Марш посвящался 45-летию Гаагской конвенции, в основу которой был положен Пакт Рериха, известный как первый в истории международный договор, взявший под свою защиту памятники культуры нашей планеты.

Экономические проблемы, возникшие за последние годы в странах СНГ, отрицательно сказываются и на духовной культуре человека. По причине невостребованности в условиях рыночной экономики и отсутствия средств на их поддержание, разрушаются памятники старины, представляющие культурное богатство народов. Приходят в упадок музеи, библиотеки, другие учреждения культуры. Наряду с этим существует угроза культурным ценностям, которую несут с собой вооруженные конфликты. Вот почему идеи Н.Рериха, русского художника, ученого и общественного деятеля, приобретают сегодня новое современное звучание и смысл.

В г.Гомеле организацию и проведение мероприятий в рамках международного марша взял на себя информационно-культурный центр "Адамант", в котором работают настоящие энтузиасты. Они подготовили серию передвижных выставок о богатом мировом культурном наследии, которые были представлены в школах нашего города, библиотеках, с их экспонатами знакомились гомельчане, пришедшие в праздничные майские дни в парк культуры и отдыха им.Луначарского. Одновременно среди жителей города ими проводился сбор подписей в поддержку марша. Их было собрано по области около 2 тысяч.

В выставочном зале ГГУ была развернута экспозиция "Колокол зовет на защиту", которая рассказывала посетителям об исторических документах — "Пакте Рериха", подписанной на его основе "Конвенции по защите культурных ценностей в случае вооруженного конфликта", рацифицированной большинством стран мира, о "Знамени Мира" — знаке триединства (добра , любви, красоты), которым обозначаются все культурные ценности, подлежащие защите. Здесь же — выставка репродукций картин известных русских и зарубежных художников разных эпох, фотографии архитектурных памятников Беларуси, коллекций Эрмитажа, Третьяковской галереи и др.

...Звучат удары колокола. Они зовут людей остановиться и задуматься о том, что не хлебом единым жив человек, что культура является проявлением всех лучших движений человеческого естества, и мы должны не разрушать, а сохранять ее ценности. Итогом марша стало принятие Обращения ко всем народам планеты "Единение, культура, знание — основы сохранения мира на земле". Зачитывается его текст, и слова Н.Рериха, которые записаны в нем, никого не оставляют равнодушными: "Не случайно мир мыслит о мире, ибо, действительно, вражда и взаимная ненависть дошли до предела... Долгожданный Мир придет через Культуру". В обращении также прозвучал призыв к каждому главе государства, политику, военачальнику и бизнесмену строго придерживаться международных соглашений в защиту культуры. Было предложено ввести в программу средних и высших учебных заведений изучение исторических документов по защите культурных ценностей.

Участники Марша Мира выступили с инициативой повсеместного проведения с 15 апреля по 14 мая ежегодного "Месячника Культуры под Знаменем Мира" за нравственную красоту и чистоту человеческой души.

**Т. ДУБЯК.**

## УДАСТОЕНЫ ПАДЗЯКІ ПРЭЗІДЭНТА

За шматгадовую і плённую навукова-педагагічную дзейнасць рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі **Леанід Аляксандравіч Шамяткоў** удастоены падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Да 30-гадовага юбілею геолага-геаграфічнага факультэта**

## ЗЯМЕЛЬНЫЯ НЕТРЫ ІМ АДКРЫВАЮЦЬ ТАЙНЫ

21 мая споўнілася 30 гадоў з дня стварэння геалагічнага факультэта ў нашым універсітэце.

З адкрыццём месцанараджэнняў нафты і газу ў Прыпяцкім прагібе паўстала пытанне аб падрыхтоўцы кадраў геолагаў, у сувязі з чым па ініцыятыве П.М.Машэрава ў 1969 годзе ў Гомельскім педагагічным інстытуце быў арганізаваны геалагічны факультэт — кузня геалагічных кадраў рэспублікі.

Ля вытокаў стварэння геафака стаялі заслужаныя і вядомыя вучоныя з многіх рэспублік былога Савецкага Саюза. Гэта — першы дэкан факультэта прафесар А.Р.Кінзікееў з Татарыі, загадчыкі кафедр — прафесар С.Д.Тураўскі з Кіргізіі, прафесар В.Г.Герасімаў з Башкірыі, дацэнты А.А.Недавізін і лаўрэат Ленінскай прэміі А.І.Кудэнка з Казахстана, дацэнт з Украіны Ю.П.Хадакоўскі, які потым стаў дэканам факультэта, беларусы дацэнты М.К.Бабкоў і М.І.Чычын.

Спачатку на факультэце спецыялістамі былі створаны вучэбныя лабараторыі: палеанталогіі і гістарычнай геалогіі — прафесарам А.Р.Кінзікеевым, мінералогіі, крышталеграфіі і петраграфіі — прафесарам С.Д.Тураўскім і дацэнтам М.Ф.Паўлавым, структурнай і рэгіянальнай геалогіі — дацэнтам А.А.Недавізіным. Беларускія вучоныя М.К.Бабкоў і М.І.Чычын стварылі лабараторыі глебазнаўства і грунтазнаўства, геадэзіі і тапаграфіі.

У першыя гады існавання факультэт рыхтаваў спецыялістаў інжынераў-геолагаў і гідрагеолагаў. Але яны мелі настолькі шырокі кругагляд і грунтоўную падрыхтоўку, што працавалі ў тым ліку і ў галіне пошуку і разведкі нафтавых і газавых месцанараджэнняў, геафізічных метадаў не толькі ў Беларусі, але і ў Заходняй Сібіры, Сярэдняй Азіі, на Далёкім Усходзе і на Сахаліне.

Былі створаны базы вучэбных практык, якія адпавядалі сучасным патрабаванням, у Крыме, ва ўрочышчы Чонкі і ў ваколіцах Гомеля ў радыусе да 100 км, на Барсукоўскім нафтавым месцанараджэнні і вакол Гомельскага хімзавода (апошнія дзве ў якасці экалагічных палігонаў).

У 1994 годзе на факультэце была адкрыта новая спецыяльнасць "Геалогія і разведка карысных выкапняў" са спецыялізацыямі: "Геафізічныя метады пошукаў"і "Гідрагеалогія і інжынерная геалогія". У сувязі з заказам вытворчага аб'яднання "Беларуснафта" арганізуецца спецыялізацыя "Геалогія і разведка нафтавых і газавых месцанараджэнняў". Філіял кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў створаны ў Інстытуце геалагічных навук НАН Беларусі і ў Гомелі ў вытворчым аб'яднанні "Беларуснафта".

На нашым факультэце дзейнічаюць геалагічны музей, 12 геалагічных кабінетаў і лабараторыі: дынамікі падземных вод, грунтазнаўства і глебазнаўства, мадэліравання гідрагеалагічных і інжынерна-геалагічных працэсаў, 5 геафізічных лабараторый, хімічная лабараторыя.

Выкладчыкі і студэнты маюць магчымасць выкарыстоўваць персанальныя камп'ютэры ў навуковых і вучэбных даследаваннях.

У 1989 годзе на базе геалагічнага факультэта адкрыта новая спецыяльнасць "Геаграфія" для забеспячэння настаўнікамі геаграфіі школ г.Гомеля і вобласці.

У сувязі з наступствамі чарнобыльскай катастрофы на факультэце летась была адкрыта спецыяльнасць "Экалогія".

Геолага-геаграфічны факультэт з'яўляецца базавым для падрыхтоўкі геолагаў, географаў і эколагаў розных напрамкаў і спецыялізацый у чарнобыльскай зоне і ў Рэспубліцы Беларусь.

За гады існавання факультэта тут падрыхтавана без уліку сёлетніх выпускнікоў 1660 высокакваліфікаваных спецыялістаў. Сёння мы ганарымся дырэктарам Інстытута геалагічных навук НАН Беларусі А.А.Махначом, дырэктарам цэнтральнага навукова-даследчага Інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў М.М.Чарапанскім, і яго намеснікам па навуцы А.М. Грэчкам, намеснікам дырэктара Інстытута геалагічных навук НАН Беларусі В.І.Пашкевічам, доктарам геолага-мінералагічных навук, заг. лабараторыямі БелНДПІнафта В.Д.Парошыным, старшынёй абласнога камітэта па выкарыстанні прыродных рэсурсаў Ульянаўскай вобласці С.І.Краўцовым, галоўным інжынерам рэспубліканскага трэста "Прамбурвод" (г.Мінск) У.А.Панасенкам і інш.

**Ю.ІВАНОЎ,**

**в.а. дэкана геолага-геаграфічнага факультэта, дацэнт.**

## ПРА СКАРЫНАЎСКІ І НАШ ЧАС

У нашым універсітэце прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя "Скарына і наш час". Уступным словам яе адкрыў прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце дацэнт М.М.Воінаў.

На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі доктары філалагічных навук з ГДУ прафесары У.В.Анічэнка, А.А.Станкевіч, а таксама прафесар В.П.Красней і кандыдат філалагічных навук М.Р.Прыгодзіч з Мінска.

Па тэматыцы канферэнцыі было заслухана і абмеркавана шэраг навуковых паведамленняў.

На заключным пленарным пасяджэнні падведзены вынікі канферэнцыі і прыняты распрацаваныя ёй рэкамендацыі.

# ЛАЎРЭАТЫ СКАРЫНАЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ -- 99



**ДАЙНЭКА Мікалай Міхайлавіч** — кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін. Манаграфія "Цэнапапуляцыйная структура і дынаміка лугавых аграэкасістэм" 1996 года выдання.

Манаграфія напісана на аснове ўпершыню праведзенага шматгадовага вывучэння заканамернасцяў фарміравання і развіцця лугавых аграэкасістэм з выкарыстаннем цэнапапуляцыйна-антагенетычнага падыходу. Гэты падыход у вывучэнні дынамікі аграэкасістэм уяўляе вялікую цікавасць як спосаб даследавання механізмаў адаптацыі раслін, якія дазваляюць віду стабілізавацца або выпадаць з цэнозаў. Сезонныя і пагадовыя змяненні сістэм рознага ўзроўню (асобіны, цэнапапуляцыі, цэнозы) дазваляюць ахарактарызаваць этапы і хуткасці развіцця біясістэм. У выніку даследавання выяўлены асноўныя заканамернасці фарміравання і этапы сукцэсіўнай дынамікі аграэкасістэм, якія адбываюцца на арганізмавым, цэнапапуляцыйным і цэнатычным узроўнях пры рознай інтэнсіўнасці антрапагеннага ўплыву. Гэта дае магчымасць выпрацаваць шляхі падтрымання травастою ў патрэбным стане і мэтанакіравана ўмешвацца ў развіццё аграэкасістэмы. Вывады аўтара ўносяць адпаведны ўклад у рашэнне актуальных праблем айчыннай аграфітацэналогіі і іх можна будзе выкарыстоўваць для стварэння тэорыі развіцця сеяных згуртаванняў.

Дадзеная праца ўяўляе цікавасць для студэнтаў, аспірантаў, навуковых работнікаў біялагічных спецыяльнасцей, а таксама спецыялістаў сельскай гаспадаркі ў галіне лугаводства і кормавытворчасці.

Манаграфія атрымала высокую ацэнку Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча НАН Беларусі.



**КАДОЛ Фёдар Уладзіміравіч** — кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры педагогікі.

Цыкл работ "Навукова-педагагічныя асновы выхавання гонару і асабістай годнасці старшых школьнікаў". Дадзены цыкл уключае 28 друкаваных работ 1994-1998 гг. выдання, у тым ліку дапаможнік для педагогаў "Выхаванне гонару і годнасці старшакласнікаў" 1998 года выдання з грыфам Навукова-метадычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Даследчая работа вялася ў русле дзейнасна-адносіннай канцэпцыі маральнага развіцця асобы. У прадстаўленым на конкурс цыкле раскрыты шляхі рэалізацыі гэтай канцэпцыі прымяняльна да працэсу фарміравання гонару і годнасці старшакласнікаў. Даследаванне праводзілася ў гісторыка-педагагічным і навукова-метадычным накірунках. У русле першага накірунку сістэматызаваны і абагулены навуковыя ідэі, якія датычацца гістарычнага развіцця паняццяў гонар і годнасць асобы, а таксама тых, што адлюстроўваюць ступень распрацаванасці вывучаемай праблемы ў класічнай і сучаснай педагогіцы. Упершыню вызначаны статус гонару і годнасці як базісна-інтэграваных якасцей асобы, іх метадычныя падыходы і накірункі выхаваўчай работы па фарміраванню гонару і асобаснай годнасці старшых школьнікаў. Паказаны магчымасці, а таксама раскрыты формы і метады фарміравання маральна-гнастычнай, эмацыянальна-валявой і паводзіннай сфер старшакласнікаў у кантэксце іх гонару і асобаснай годнасці. Вынікі могуць быць выкарыстаны ў рабоце настаўнікаў і класных кіраўнікоў агульнаадукацыйных школ, выкладчыкаў тэхнікумаў, каледжаў і прафтэхвучылішчаў, а таксама ў працэсе арганізацыі педагагічнай практыкі студэнтаў.



**КЛЮЧНІКАЎ Юрый Андрэевіч** — кандыдат юрыдычных навук, загадчык кафедры крымінальнага права і працэсу, дэкан юрыдычнага факультэта.

Навуковая работа "Прававое рэгуляванне на папярэднім следстве: прадмет, механізм, спосабы" 1998 г. выдання.

Манаграфія ўяўляе вялікую навуковую цікавасць. Па сваім змесце гэтая работа не мае аналагаў у Беларусі, паколькі тэма раней не распрацоўвалася і не асвятлялася ў крымінальным працэсе Беларусі. У рабоце прапанаваны новы падыход і новыя погляды на праблему прававога рэгулявання на стадыі папярэдняга следства. Стадыя папярэдняга следства з'яўляецца адной з галоўных у крымінальным працэсе. Следчым расследуецца пераважная колькасць крымінальных спраў. Разгледжаныя ў манаграфіі пытанні, якія датычацца дзейнасці следчага, садзейнічаюць паспяховай барацьбе са злачыннасцю ў Беларусі і Расіі. У манаграфіі шмат карысных парад, якія значна могуць уздзейнічаць на якасць і эфектыўнасць расследавання крымінальных спраў. Дадзеная манаграфія з'яўляецца першай работай на юрыдычным факультэце, якая абгрунтавана і дэталёва разглядае праблемы крымінальна-працэсуальнай работы следчага. Вынікі, якія выкладзены ў манаграфіі, акажуць вялікую дапамогу ў рабоце следчых.



**САФОНАЎ Васіль Рыгоравіч** — кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі, начальнік НДС.

Цыкл работ "Кратна лакальныя фармацыі з зададзенымі сістэмамі падфармацый" уключае 14 друкаваных работ 1994-1998 гг. выдання.

Адной з агульных задач даследавання ў тэорыі фармацый груп з'яўляецца класіфікацыя лакальных фармацый. На сучасным этапе рэалізацыя гэтай задачы ідзе ў асноўным па шляху выдзялення і класіфікацыі розных тыпаў фармацый, якія важныя для дадаткаў.

Гэты цыкл работ прысвечаны вывучэнню кратна лакальных фармацый канечных груп, якія маюць зададзеныя абмежаванні на падфармацыі. У прыватнасці, тут будуецца агульная тэорыя мінімальных n-кратна лакальных нефармацый. Атрыманыя назіранні выкарыстоўваюцца для апісання крытычных n-кратна лакальных фармацый для такіх класаў, як класы ўсіх вырашальных, $\pi$-вырашальных, $\pi$-нільпатэнтных, звышвырашальных, $\pi$-звышвырашальных груп і г.д. Вынікі аб крытычных n-кратна лакальных фармацыях прымяняюцца пры даследаванні кратна лакальных фармацый з сістэмамі спадчынных і нармальна спадчынных падфармацый, кратна лакальных фармацый зададзеным $\mathfrak{N}$-дэфектам, а таксама кратна лакальных фармацый з дадатковымі падфармацыямі. Акрамя таго, у цыкле работ даследуюцца перасячэнні максімальна n-кратна лакальных падфармацый (n-падфармацыя Фрацціні) n-кратна лакальнай фармацыі.

Адным з асноўных вынікаў цыкла работ з'яўляецца класіфікацыя вырашальных n-кратна лакальных фармацый нільпатэнтнага дэфекта 3, што, у прыватнасці, дае вырашэнне праблемы Шамяткова-Скібы, пастаўленай у іх сумеснай манаграфіі "Фармацыі алгебраічных сістэм", у класе вырашальных груп.



**ФЯСЬКОЎ Аляксей Андрэевіч** — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры філасофіі.

Манаграфія "Спорт як сацыякультурная з'ява" 1998 г. выдання.

Галоўная мэта манаграфіі — паказаць, што чалавечая асоба не можа быць вывучана сродкамі адной-дзвюх навук, асабліва ў хуткапераменлівых умовах палітычнага, эканамічнага, агульнакультурнага, экалагічнага, рэлігійнага аспектаў жыцця грамадства.

На гэтай аснове ў структуры каштоўнасцей асобы павінна ляжаць гармонія. Гармонія важная ва ўсім, але перш за ўсё ў самім сабе. Менавіта гэтай мэце павінны служыць фізкультура і спорт.

У манаграфіі сцвярджаецца, што "если поражение от победы ты сам не должен отличать" — маральная пазіцыя адносін атлетаў і іх настаўнікаў, то гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі ў матэрыяльных адносінах узнагароджанне будзе роўным, калі жыццё цела і жыццё духа будзе зрушаным у бок духоўнасці, гуманнасці, добразычлівасці аднаго ў адносінах да ўсіх і наадварот. Спорт дае такія магчымасці, але грамадства пакуль іх выкарыстоўвае абмежавана і не зусім умела. У сувязі з гэтым у манаграфіі на дастаткова вялікім факталагічным матэрыяле сцвярджаецца, што прагрэс чалавека, удасканаленне яго фізічных, інтэлектуальных, маральных і эстэтычных якасцей, рыс характару абумоўлены прагрэсам грамадства ў цэлым, а універсальным сродкам удасканалення біясацыяльнай прыроды чалавека выступаюць фізічная культура і спорт.

**В СКРЭЖЭНДЗЕЎСКАЯ,**
**вядучы інжынер СНТІ НДС, сакратар конкурснай камісіі.**

**Фота У.Чысціка.**

## ВУЧОНЫЯ, ЦІ ЗАДАВАЛЬНЯЕ ВАС ЗАРОБАК?

| Наименование должностей | Исходный оклад | Повыш. тар.став. за стаж, % | Повыш. тар.став. за стаж, сумма | Должностной оклад |
|---|---|---|---|---|
| **Заведующий кафедрой** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 11 459 500р. | 20% | 2 291 900р. | 13 751 000р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 11 459 500р. | 15% | 1 718 925р. | 13 178 000р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 11 459 500р. | 10% | 1 145 950р. | 12 605 000р. |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 11 459 500р. | 5% | 572 975р. | 12 032 000р. |
| имеющ. стаж до 1 года | 11 459 500р. | 0% | -р. | 11 460 000р. |
| **Профессор** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 10 922 000р. | 20% | 2 184 400р. | 13 106 000р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 10 922 000р. | 15% | 1 638 300р. | 12 560 000р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 10 922 000р. | 10% | 1 092 200р. | 12 014 000р. |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 10 922 000р. | 5% | 546 100р. | 11 468 000р. |
| имеющ. стаж до 1 года | 10 922 000р. | 0% | -р. | 10 922 000р. |
| **Доцент** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 9 911 500р. | 20% | 1 982 300р. | 11 894 000р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 9 911 500р. | 15% | 1 486 725р. | 11 398 000р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 9 911 500р. | 10% | 991 150р. | 10 903 000р. |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 9 911 500р. | 5% | 495 575р. | 10 407 000р. |
| имеющ. стаж до 1 года | 9 911 500р. | 0% | -р. | 9 912 000р. |
| **Старший преподаватель** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 9 438 500р. | 20% | 1 887 700р. | 11 326 000р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 9 438 500р. | 15% | 1 415 775р. | 10 854 000р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 9 438 500р. | 10% | 943 850р. | 10 382 000р. |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 9 438 500р. | 5% | 471 925р. | 9 910 000р. |
| имеющ. стаж до 1 года | 9 438 500р. | 0% | -р. | 9 439 000р. |
| **Ассистент, преподаватель** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15 лет | 8 557 000р. | 20% | 1 711 400р. | 10 268 000р. |
| имеющ. стаж свыше 10 лет | 8 557 000р. | 15% | 1 283 550р. | 9 841 000р. |
| имеющ. стаж свыше 5 лет | 8 557 000р. | 10% | 855 700р. | 9 413 000р. |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 8 557 000р. | 5% | 427 850р. | 8 985 000р. |
| имеющ. стаж до 1 года | 8 557 000р. | 0% | | 8 557 000р. |

**Доплаты в месяц:**
за ученую степень доктора наук -- (6 мин.з/пл.) -- 6 000 000р.;
кандидата наук – (3мин. з/пл.) -- 3 000 000р.;
за и.о. декана – (70% от ст.1 разряда) -- 1 505 000р.;
за и.о. зам. декана – (65% от ст.1 разряда) -- 1 397 500р.

## СТУДЭНЦКАЯ СТЫПЕНДЫЯ

**Па дадзеных універсітэцкай сталовай кошт абеда для студэнта абыходзіцца мінімум у 100 тыс. руб. Сацыяльная стыпендыя з мая г.г. складае 1 млн. 600 тыс. руб. Сціпла — на 16 абедаў. А як жа жыць у рамках устаноўленага жыццёвага мінімуму?**

**На гэта пытанне рэдакцыя нашай газеты адказаць не можа.**

З 1 мая г.г. устаноўлены дзяржаўныя стыпендыі для студэнтаў ВНУ ў наступных памерах: імянная стыпендыя — 3 млн. 900 тыс. руб.; вучэбныя стыпендыі па выніках сесіі для студэнтаў гуманітарных, эканамічных і педагагічных спецыяльнасцей складаюць пры балах: ад 3,6 да 4,0 — 2 млн. руб., ад 4,0 да 4,5 — 2 млн. 200 тыс. руб., ад 4,5 да 5,0 — 2 млн. 600 тыс. руб., пры 5,0 — 3 млн. руб.; для студэнтаў прыродазнаўча-навуковых і тэхнічных спецыяльнасцей пры балах: ад 3,4 да 4,0 — 2 млн. руб., ад 4,0 да 4,5 — 2 млн. 400 тыс. руб., ад 4,5 да 5,0 — 2 млн. 800 тыс. руб., пры 5,0 — 3 млн. 200 тыс. руб.

Персанальная стыпендыя савета ВНУ складае 2 млн. 600 тыс. руб., сацыяльная стыпендыя — 1 млн. 600 тыс. руб.

Для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення з ліку дзяцей сірот і дзяцей, якія засталіся без апякунства бацькоў, стыпендыя выплачваецца ў памеры 1 млн. 250 тыс. руб.

Попытайтесь найти у Пушкина устаревшие, потерявшие свою значимость мысли, и вы даже после самых пристрастных изысканий признаете: их нет. Такова природа пушкинского гения, в этом заключается суть классических творений.

Невозможно представить, что мы подражаем Пушкину. Пушкин, как и вся великая литература, отвергая подражание, учит мыслить, ведет к познанию мира, таинственного, необъятного, бесконечного в своей непознанности.

Духовное созревание Пушкина шло необычайно быстро. Его поэтический дар обещал великие откровения. Уже в ранней поэзии Пушкина открылась суть его таланта, столь понятная и совпадающая с глубинными импульсами развития человечества: великий дар жизнелюбия, восхищения и удивления таинством жизни, признание жизни как наивысшей ценности бытия.

Наверное, точнее всех выразил пушкинское благоговение перед чудом жизни Гоголь: "Он заботился только о том, чтобы сказать одним одаренным, поэтическим чутьем: смотрите, как прекрасно творение бога! И не прибавляя ничего больше, перелететь к другому предмету затем, чтобы сказать также: смотрите, как прекрасно божие творение".

Лирические шедевры поэта передают и читателю заряд жизнестойкости, мудрое отношение к жизни, величайшую целеустремленность. Пушкин-человек вынужден был претерпеть и превратности двух ссылок, и "исключение со службы", и неблагосклонность монарха. Но все социальные унижения не могли помешать восхождению к цели, к которой упорно в мучительных исканиях истины и идеала шел художник.

В лирике Пушкина нарастает ощущение тайного родства пламенного духа художника и духа "свободной стихии". Поэт осознает в себе необычайный дар, которым наделен свыше. Его "святая лира" подвластна неким особым непознанным законам. Внимая божественному глаголу, воспаряя ввысь, туда, где слышен лишь голос божества, она возносится за пределы земли, ведет диалог с самим мирозданием.

Ощущение высокого предназначения не покидает поэта. Невидимая огромная внутренняя работа свершается в нем, пробуждая к новой миссии. Происходит преображение, перерождение великого поэта в поэта-пророка, символически запечатленное в стихотворении "Пророк".

**К 200-ЛЕТИЮ СО ДНЯ РОЖДЕНИЯ ГЕНИЯ РУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ**

# ДИАЛОГ ЧЕРЕЗ ДВА ВЕКА

Ясный пророческий голос поэта знала вся просвещенная Россия. "Звонкая и широкая песнь Пушкина раздавалась в долинах рабства и мучений", призывая к освобождению страны от крепостничества. Поэмы "первого поэта России" открывали неисчерпаемые богатства национальной культуры, в романе в стихах завершалось создание "энциклопедии жизни русского народа". Ни один поэт в России еще не находил столь высокого признания, как Пушкин.



Его искусству воздавались самые возвышенные похвалы: "... Он нежен, сладен, мягок, как ропот волны, тягуч и густ, как смола, ярок, как молния, прозрачен и чист, как кристалл, ... крепок и могуч, как удар меча в руке богатыря", — восторженно писал Белинский.

"Пушкин явление чрезвычайное", — утверждал Гоголь. Его человеческий и творческий дар во всем выражался в чрезвычайной мере совершенства, являя собой пример наивеличайшего служения своему таланту. Пушкин уже достиг вершин поэтического Олимпа, но послушный высшему закону, он не мог удовлетвориться сотворенным. Глубинным внутренним чутьем он ощущал необходимость движения вперед, угадывал сокрытые пути развития литературы, которые видел прежде всего в обращении к первоистокам — народному творчеству.

На взгляд окружающих, Александр Сергеевич совершает вовсе непонятные поступки. Из Михайловского в праздничные дни он выезжает на святогорскую ярмарку. Не желая выделиться среди крестьян, надевает соломенную шляпу, армяк, накинутый на красную рубаху. Его густые бакенбарды почти не отличаются от мужицкой бороды. Он записывает народные сказки, песни. И, может быть, уже видит свою первую сказку "О попе и его работнике Балде", разыгранной в раешнике труппой бродячих актеров, и счастлив, что его "веселое представление" потешает и смешит простого русского мужика.

Высшим воплощением совершенства мира, гармонии, всей полноты жизни для Пушкина являлась красота. Художник всегда мечтал быть свободным, и как истинный эллин наслаждаться прекрасным:

**По прихоти своей скитаться здесь и там,**
**Дивясь божественным природы красотам,**
**И пред созданьями искусств и вдохновенья**
**Безмолвно утопать в восторге умиленья —**
**Вот счастье! Вот права!**

Поэта чаруют великолепные картины природы, совершенство полотен Рафаэля, исполненная небесной силы музыка Моцарта, искусный резец ремесленника. Он "благоговеет богомольно перед святыней" и "мощной властью красоты", уверен, что прекрасное дано не напрасно, не случайно.

Но более всего Пушкина волнует, тревожит, завораживает небесная прелесть земной женщины. Прекрасная женщина излучает некий свет, вокруг нее все сразу оживает, сердечный жар зажигается в груди поэта.

Для Пушкина любовь всегда была высшим даром судьбы, тем священнодействием, вне которого не существует человек.

Долгожданный земной идеал женщины он нашел в Наталье Николаевне Гончаровой, с которой венчался 18 февраля 1831 года. У постоянного скитальца Пушкина наконец-то появился свой дом, где была хозяйка, любимая жена, к которой он сохранил чувство любви и нежности на протяжении недолгой совместной жизни.

Грозовые тучи часто собирались над головой писателя. И нередко в жизненных скитаниях на его пути маячили бесы. Исключительно ранимая душа художника чутко реагировала на ссылку друзей-декабристов, преждевременную смерть лицеистов Дельвига, Корсакова, на оскорбительное покровительство царя, "хвалу и клевету" света. В такие минуты лира певца издает самые трагические, самые печальные звуки:

**Дар напрасный, дар случайный,**
**Жизнь, зачем ты мне дана?**
**Иль зачем судьбою тайной**
**Ты на казнь осуждена?**

Если бы не было у Пушкина столь драматических стихов, мы, наверное, меньше бы доверялись общему жизнерадостному пафосу его творчества. Поэт изведал, познал жизнь во всей полноте ее явлений. Им пережиты и тоскливое одиночество, и горькое разочарование, и минуты уныния. Но никогда личная печаль и страдания не возводились им по-байроновски до степени "мировой скорби". Он, как истинный христианин, скорбное и грустное воспринимает как часть бытия, в едином потоке той жизни, которая дарована человеку для радости и счастья.

Поэт не мыслил мир без таких понятий, как честь, совесть, долг. "Души прекрасные порывы" он воспевал в ранней лирике, "беречь честь смолоду" поучал молодое поколение будучи уже зрелым писателем, отстаивать высший кодекс чести вышел с пистолетом в руках в морозное февральское утро 1837 года.

Первый поэт России, истинный гражданин своего Отечества, любящий муж и отец, он находился в самом расцвете физических и творческих сил. Он страстно любил жизнь и хотел жить. Но жить, не теряя человеческого достоинства, сохранив честь своей семьи, не запятнав трусостью дворянский мундир. И он сделал все, чтобы остаться в глазах потомков самым светлым, чистым именем — Пушкин.

Достойно заканчивалась житейская биография поэта и начиналась его новая жизнь в последующих поколениях. Вслушайтесь: и сегодня "живая песнь" Пушкина пробуждает в нас "чувства добрые" и "милость к падшим". Вглядитесь: светлый облик поэта не меркнет в дали времен. Осознайте: его мысль стала еще богаче, пройдя сквозь два столетия. Чувствуете: в магическом кристалле пушкинского слова-образа сконцентрирована духовная энергия, необходимая как солнечный свет, без которого чахнет жизнь на земле.

**Н.КАПШАЙ,**
**доцент**
**кафедры русской литературы.**

**ОТВЕТЫ НА ВОПРОСЫ ПУШКИНСКОЙ ВИКТОРИНЫ**

# ОТ АКАДЕМИКА ДО ШКОЛЬНИКА

"Любви все возрасты покорны". Перефразируя известные слова поэта, мы бы сказали: Пушкину покорны и все возрасты, и все профессии, и все национальности. В конкурсе в той или иной мере приняли участие и академики, и профессора, и школьники, студенты и ветераны. Всех благодарим за участие.

В викторине, предложенной вниманию читателей в нашей газете от 23 февраля, был 21 вопрос. Тематика викторины составлялась и членами редколлегии "Гомельскага універсітэта", и преподавателями кафедр, и студентами. Кстати, самый каверзный вопрос предложил ректор университета, доктор физико-математических наук, член-корреспондент НАН Беларуси Л.А.Шеметков (вопрос 20).

В результате конкурса определены победители. Ими стали:

**1. Клеменцова Екатерина – студентка IV курса филфака.**
**2. Дюбкачева Марина – студентка I курса геолого-географического факультета.**
**3. Евдокименко Георгий Саввич – пенсионер, ветеран Великой Отечественной войны.**
**4. Ермакова Елена Николаевна – ассистент кафедры белорусского языка.**
**5. У Хао (Миша) – студент V курса филфака (Китай).**
**6. Беляева Мария и Жаренкова Вероника – ученицы 10 литературного класса СШ № 56.**

А в этом номере мы публикуем ответы на вопросы викторины, посвященной А.С.Пушкину.

1. Знаменитую пушкинскую речь Ф.М.Достоевский произнес в 1880 году по случаю открытия памятника А.С.Пушкину. Скульптор А.М.Опекушин.

2. Кто не знает великого послания поэта в Сибирь узникам-декабристам? Это стихотворение шло целевым назначением и было передано им Александрой Муравьевой. Она последовала в Сибирь за мужем, прожила там 9 лет и умерла там же.

3. Проклятым хохлом (конечно же, с дружественными, юмористическими интонациями) поэт называл Н.В.Гоголя, которому Пушкин дал сюжеты "Ревизора" и "Мертвых душ".

4. Вполне возможно, что Н.В.Гоголь, отвечая любезностью за столь дорогие "подарки", увековечил образ поэта, слава которого была бессмертна, в словах Хлестакова. Этот герой, оказывается, с Пушкиным был на дружеской ноге и называл его братом и большим оригиналом. "Ревизор" Гоголя вечен, а в нем еще раз вечен и Пушкин.

5. Речь идет о романе "Евгений Онегин". В тексте герой назван как генерал, муж Татьяны Лариной. И только. В одноименной опере П.И.Чайковского ему дано имя – Гремин. Ария Гремина, наряду с ариями Ленского, Онегина, письмом Татьяны — одно из самых ярких мест оперы.

6. Роман "Евгений Онегин" посвящен профессору Московского университета Плетневу.

Вот начало посвящения:

**Не мысля гордый свет забавить,**
**Вниманье дружбы возлюбя,**
**Хотел бы я тебе представить**
**Залог достойнее тебя.**

Есть в короне русской литературы бриллианты, их немало, но так скромно отозваться о своем великом детище мог только Пушкин.

7. В 20-е годы в истории русской литературы советского периода весьма популярны были левоавангардистские концепции в критике и литературоведении. Согласно основополагающим идеям левоавангардистов подлинное – пролетарское искусство может быть создано пролетарием по происхождению и на пролетарскую тематику. На полном серьезе заявлялось, что Пушкин не отразил в своих произведениях труд шахтеров. Только ли это не отразил в своих произведениях поэт? Да и должен ли он все отразить? Споры велись, пока какой-то остряк не припомнил знаменитое пушкинское "Во глубине сибирских руд". Поэт был "реабилитирован".

8. По произведениям Пушкина написано 10 опер. Наиболее известны "Евгений Онегин" Чайковского, "Руслан и Людмила" Глинки, "Пиковая дама" Чайковского, "Борис Годунов" Мусоргского, "Моцарт и Сальери", "Сказка о царе Салтане", "Золотой петушок" Римского-Корсакова, "Русалка" Даргомыжского.

Полный ответ на этот вопрос никто из конкурсантов не дал.

9. Романсы на слова Пушкина:

"Я вас любил", "На холмах Грузии", "Редеет облаков летучая гряда", "Медлительно влекутся дни мои", "Ненастный день потух", "Я помню чудное мгновенье", "Ночной зефир", "В крови горит огонь желанья", "Где наша роза".

10. Вопрос о кинофильмах по произведениям Пушкина. Их столько, что одно перечисление заняло бы страницу. Экранизированы почти все "Повести Белкина", "Пиковая дама", "Арап Петра Великого". На экран переведены многие оперы по мотивам произведений поэта, в наше время ведутся съемки фильмов по произведениям Пушкина. И сейчас он оказался наряду с Чеховым самым экранизируемым писателем.

11. Афоризмы Пушкина. Во всех сборниках крылатых слов и афоризмов в именном указателе более 80 раз упоминается имя поэта. Наиболее известные из них будут опубликованы в следующем номере.

Эти мысли универсальны, они вполне применимы и к пушкинскому времени, и к последующему, и к сегодняшнему.

12. Поставив последнюю точку в "Борисе Годунове", Пушкин плясал от радости и восклицал: "Ай да Пушкин! Ай да сукин сын!"

13-14. Живописцы тоже не обошли вниманием личность Пушкина и его друзей.

Известное стихотворение Пушкина "К морю" иллюстрировано Репиным (портрет поэта) и Айвазовским (море):

Н.Ге – "Пущин в гостях у Пушкина в Михайловском".

И.Репин – "Пушкин на лицейском экзамене".

15. В произведениях поэта есть строки: "Едва ли вы в Москве найдете три пары стройных женских ног". Установлено исследователями, что их обладателями были Раевская (ей и посвящены эти строки) и Воронцова. Третья владелица неизвестна. Ищите, дерзайте!

Но прямо скажем, что и гений тоже может ошибаться. Красавиц у нас, мягко говоря, было и будет существенно больше.

16. Стихи: **/Какой ценой купил он право Над всем так мудро и лукаво Шутить, таинственно молчать И ногу ножкой называть/** принадлежат Анне Ахматовой. Марина Цветаева написала книгу о Пушкине. А если мы назовем всех поэтов и писателей, создававших произведения о Пушкине, то целого номера газеты не хватит.

17-18. Самым неприличным танцем в пушкинское время считался вальс. Но интересно, что каждый танец в то время имел свое значение. Это и полонез (польский танец) – официально открывающий бал). Это и мазурка, это и вальс. Кстати сказать, Наталья Ростова первый свой взрослый танец вальсирует с князем Андреем. А князь был современником Онегина и Пушкина. И этот танец был самым верным для свиданий и для вручения писем. А местом для свиданий был бал.

19. Шляхтич Павел Островский – "Метель".

20. Самый каверзный вопрос (о нем мы писали выше): почему слово "рысь" и "плетется" стоят рядом? На этот вопрос правильный ответ дал только зав. кафедрой белорусской литературы профессор И.Ф.Штейнер. Дело в том, что лошадь, впервые в году увидя новую дорогу, боится нестись быстро – рысью и галопом. Но поскольку мы договорились, что преподаватели-литераторы не участвуют в конкурсе, мы шлем им дружеский привет и теплое товарищеское рукопожатие. А это, на наш взгляд, дороже премий и даже грамот.

21.Себя, как в зеркале я вижу, но это зеркало мне льстит" – сказано о портрете художника О.Кипренского "Пушкин", который помещен в заголовке викторины.

# “СЁННЯ Ў НАШАЙ ХАЦЕ СВЯТА...”

“Не ведаючы мінулага, нельга пабудаваць шчаслівую будучыню” — залатыя словы. Пакаленне змяняе пакаленне, і трэба браць у продкаў тое лепшае, светлае і разумнае, што накоплена гадамі. Гэта, вядома, у першую чаргу, — народныя традыцыі. Трэба вучыцца валодаць імі і паказваць свае здольнасці іншым. Гэта і зрабіла група РБ-13 філалагічнага факультэта. Нягледзячы на гарачы час перад сесіяй, студэнты шляхамі плённай і доўгай працы падрыхтавалі паказ беларускага народнага вяселля пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры рускай літаратуры Людмілы Леанідаўны Ермаковай.

І вось філалагічны факультэт абудзіў вясельны гоман, які не дазволіў ні выкладчыкам, ні студэнтам прайсці міма. Вяселле ўключала некалькі дзеяў.

Першай была сцэна заручын. Гучыць музыка, на тварах гасцей — усмешкі, на стале — шмат святочных страў. Гэта значыць — сваты прыехалі! Жарты сябровак нявесты, звонкі голас свацці Таўкачыхі (Г.Галаванавай), прывітальныя звароты шаноўнага свата, душэўнасць гаспадароў хаты (бацькоў нявесты), гоман гасцей — усё гэта не дазваляла гледачам ні на хвіліну пакінуць без увагі нашых акцёраў. Потым дзеянне перанеслася ў царкву, дзе адбылося вянчанне маладых. Гэта сцэна вельмі здзівіла прысутных. Артыстычна тут сябе праявіў “святы айцец” К.Затрымайлаў, староста групы. Яго знешні выгляд адпавядаў святочнаму абраду. А інакш і не магло быць: чырвоны “галаўны ўбор”, доўгая ўзорыстая “раса-пакрывала” і дадаткова царкоўная музыка, пад якую і выйшаў да “прыхаджан” наш свяшчэннік — прыцягнула нават самых неактыўных гледачоў.



Самае ж цікавае пачалося тады, калі маладыя і госці, “прыехаўшы з царквы”, былі запрошаны да стала. Тут не забыліся і пасумаваць аб жаночай долі, і нават паразмаўляць аб такім цудзе на вёсцы як радыё, і, канечне, згадалі, як “Касіў Ясь канюшыну” і “У садзе гуляла”. Быў і гумар, і дасціпнасць, і смех. Гасцей частавалі як мага лепш, каб не паскардзіліся. І ўсе яны засталіся задаволеныя. Толькі вось гарэлка аказалася горкай, і справа дайшла да таго, што ўсе прысутныя крыкнулі: “Горка!”. Пасля гэтага прыехаўшыя “музыкі” зайгралі беларускую “Польку”, і ўсе кінуліся ў скокі. А праз некаторы час хату абудзіў голас свата: “Ці ёсць у гэтай хаце бацька з маці? Ці дазволяць каравай раздаці?”

З гэтай нагоды было сказана шмат добрых слоў маладым. Чаго толькі ім не падаравалі! Пачынаючы са скрынкі шпонак (“каб (малады) не любіў чужых жонак”) і медзі (“каб дзеці былі, як мядзведзі”), і завяршыўшы хатай з хлявом, які прадаставілі не нейкія спонсары, а бацька жаніха. Бацькі нявесты пры гэтым падаравалі ліст (“каб радзіўся сын і быў гарманіст”). Нічога... Таксама добры падарунак, галоўнае, — ад усяго сэрца.

Свае віншаванні выказалі і запрошаныя выкладчыкі.

Гледачы не хацелі развітацца з утульнай “хатай групы РБ-13”, але ж усё добрае калісьці заканчваецца, і ўдзельнікі вяселля, выйшаўшы з-за стала з песняй “Бывайце здаровы, жывіце багата”, развіталіся.

Прадстаўленне скончылася, але засталося пачуццё творчага задавальнення і радасці. А як жа: сябе паказалі, ды і ўбачылі з другога боку сваіх сяброў, а колькі да гэтага было невядомых талентаў.

**Таццяна ЦЕЛЯХОВІЧ,**
**Сяргей ПАДСАСОННЫ,**
**студэнты групы РБ-13**
**філалагічнага факультэта.**

# ВЫВУЧАЕМ ГІСТОРЫЮ НЕ ПА ПАДРУЧНІКУ...

У канцы красавіка мы — студэнты I курса факультэта замежных моў, зрабілі незабыўную паездку ў г.Полацк, арганізаваную нашай выкладчыцай тэорыі і гісторыі культуры В.М.Лебедзевай.

Вядома ж, мы шмат чулі пра гэты старажытнейшы горад Беларусі і адзін са старэйшых гарадоў усходніх славян (першае летапіснае ўпамінанне адносіцца да 862 г.) і аб яго знакамітасцях.

Полацк даў свету геніяльных асветнікаў Е.Полацкую, Ф.Скарыну, С.Полацкага.

Дзякуючы паездцы мы змаглі непасрэдна дакрануцца да таямніц полацкай зямлі, убачыць сваімі вачыма Сафійскі сабор — пачатак полацкай архітэктурнай школы, пачуць аб загадкавым лёсе яго багацейшай бібліятэкі і гісторыю крыжа Ефрасінні Полацкай, прылічанай да ліку святых. Спаская царква з яе фрэскамі — надзвычайны архітэктурны помнік славянства, адзінае месца на Беларусі, дзе можна палюбавацца падобнай работай старажытных майстроў.

Вельмі цікава было наведаць музей беларускага кнігадрукавання і шэраг іншых гісторыка-культурных помнікаў. Не так і многа іх захавалася ў Полацку, але ўсе яны маюць вялікую гістарычную каштоўнасць.



Наведванне г.Полацка, знаёмства з яго старажытнай культурай і гісторыяй, усведамленне таго, што мы пабывалі на той зямлі, дзе нашы карані, дзе наша старажытнейшая гісторыя — гэта ўсё прымушае задумацца “аб вечным, успомніць, хто мы, адкуль і куды ідзём”, ганарыцца сваёй Радзімай, імя якой Беларусь, яе мінулым і сучасным.

**Л.ЛІТВІНАВА,**
**студэнтка гр.А-11 факультэта замежных моў.**
**На здымку: Спаса-Прэабражэнскі манастыр у г.Полацку.**

# КРОКІ ПЕРШЫЯ, АЛЕ ЎПЭЎНЕНЫЯ

Адна з самых “маладых” спецыяльнасцей у нашым універсітэце — псіхалогія. Набор студэнтаў на яе пачаўся з 1997 года. Відавочна, што няма пакуль у яе такіх даўніх традацый, што склаліся на факультэтах, шлях якіх вымяраецца ўжо дзесяцігоддзямі. У будучых псіхолагаў — усё яшчэ наперадзе.

І вось нядаўна зрабілі яны свае першыя крокі ў навуку — сталі ўдзельнікамі І-й універсітэцкай навуковай канферэнцыі студэнтаў-псіхолагаў. Адкрываючы яе ўступным словам, дэкан факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар С.Ф.Каморнікаў падкрэсліў, што без належнага развіцця студэнцкай навукі не можа развівацца на факультэце і сам вучэбны працэс. Важна таксама падключаць студэнтаў да практычных псіхалагічных даследаванняў, у якіх ёсць вострая неабходнасць у нашай вобласці.

Выступленням непасрэдна саміх студэнтаў на канферэнцыі папярэднічалі грунтоўныя даклады загадчыка кафедры псіхалогіі дацэнта А.А.Лытко “Псіхалагічная навука і практычная псіхалогія” і дацэнта М.І.Мурачкоўскага “Праблема навуковай творчасці студэнтаў”.

На трох секцыйных пасяджэннях канферэнцыі — “Развіццё асобы ў антагенезе”, “Псіхалагічныя праблемы выхавання і навучання”, “Практычная работа псіхолага” былі заслуханы і абмеркаваны 23 даклады студэнтаў-другакурснікаў. Іх першыя самастойныя даследаванні былі сур’ёзнымі, аргументаванымі, прадэманстравалі належны ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі, які забяспечваюць выкладчыкі кафедры.

7 лепшых дакладаў рэкамендаваны на XXVIII універсітэцкую студэнцкую навуковую канферэнцыю па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках, для апублікавання ў зборніку “Творчасць маладых-99”.

**Т.ДУБЯК.**

# СУСТРЭЧА З МІНУЛЫМ

Адбыўся культпаход студэнтаў-першакурснікаў беларускага аддзялення на пастаноўку “Камедыі” К.Марашэўскага, тэатралізаваную Мінскім Малым тэатрам.

Нам, студэнтам, было асабліва цікава і карысна ўбачыць гэтую п’есу, бо творчасць К.Марашэўскага вывучаецца намі ў курсе гісторыі старажытнай літаратуры.

Галоўны герой “Камедыі”, селянін Дзёмка, вельмі незадаволены сваім лёсам. Сапраўды, мала чаго прывабнага і шчаслівага было ў жыцці сялян, бяспраўных, прыгнечаных, абцяжараных непамернай працай. Дзёмка скардзіцца на сваё жыццё: “Вот і цяпер мазаліцца трэба, аддыхнуць некалі... Усё нам на проціў ідзець. Усё нам на няшчасце. Не спадзеватца дабра. Нішто так не ўдаецца, як мы хочэм”.

А хто ж вінаваты ў няшчасцях і нягодах Дзёмкі? Ён перакананы, што прычына яго няўдач – грэх біблейскага Адама.

Чорт, які з’яўляецца перад селянінам, абвяргае яго думку. Адам быў чалавекам слабым і бязвольным, таму і не ўтрымаўся ад спакусы. Так і ён, Дзёмка, наўрад ці зможа прамаўчаць хаця б гадзіну...

Заключаецца заклад на Дзёмкаву душу. Чорт тройчы спакушае яго, а селянін тройчы парушае дадзенае слова.

Такім чынам Дзёмка нібы абвяргае самога сябе, сцвярджае, што ні грэх Адама, ні наканаванасць нябёсаў не ўплываюць на чалавечае жыццё. Усё залежыць толькі ад самога чалавека. Нездарма ж кажуць, што чалавек сам каваль свайго шчасця. Так што не трэба шукаць прычыну сваіх бядот ва ўчынках іншых людзей, у волі Бога, а трэба заўважаць і заўсёды шукаць нешта такое, што б упрыгожвала кожны дзень твайго быцця, радавала цябе, нават калі жыццё здаецца невыносна змрочным і цяжкім.

Хочацца сказаць шмат цёплых слоў у адрас акцёраў, якія здолелі перанесці нас, гледачоў, у мінуўшчыну, перадаць каларыт беларускай мовы, якая ў XVIII ст. мела крыху іншае гучанне, чым зараз. Ігра акцёраў была цудоўнай, за што яны і былі ўзнагароджаны апладысментамі і ўсмешкамі ўдзячных гледачоў.

Адзінае, на маю думку, што крыху прыніжала вартасць гэтай пастаноўкі, – імкненне перарабіць “Камедыю”, якая была напісана ў 1787 г., на сучасны манер. Мне здаецца, што без такіх рэплік, як “Давідэ-Коперфільдэ”, “Свабоду неграм!” і інш, што хоць і было смешным, але выглядала вельмі недарэчна, пастаноўка “Камедыі” толькі б выйграла.

Пасля прадстаўлення мы абменьваліся сваімі ўражаннямі, былі вельмі эмацыянальнымі і задаволенымі. Хацелася б, каб адно з пытанняў на экзамене па гісторыі старажытнай літаратуры тычылася менавіта творчасці К.Марашэўскага.

**Наталля ФІЛІМОНАВА,**
**студэнтка гр.Б-12 філалагічнага факультэта.**

*Для вас, дачники*

# ВЫБЫВАЕШЬ? ВЫБЫВАЙ!

**В садоводческих товариществах возникает немало споров о том, могут ли их члены, которые приватизировали земельный участок, прекратить уплату членских взносов и выйти из членов товарищества.**

Вот что трактует закон.

В соответствии со ст.77 Кодекса Республики Беларусь о земле приватизация земельного участка (выкуп в частную собственность) в товариществе не является основанием для прекращения членства. Частью 2 ст.77 предусмотрено, что при прекращении членства лицо, выбывшее из членов товарищества, обязано в течение одного года распорядиться садовым домиком, другими строениями и сооружениями, а при наличии земельного участка в частной собственности – и земельным участком.

Поэтому член садоводческого товарищества, приватизировавший свой участок, может прекратить свое членство в товариществе только при выполнении указанных требований.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб’ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 264.
Падпісана да друку ў 15.00 21.05.1999 г.